УДК 94(476) + 323.15 (476)

*І.А. ПУШКІН**

# ДЗЯРЖАЎНЫЯ ОРГАНЫ ПА РЭГУЛЯВАННІ МІЖНАЦЫЯНАЛЬНЫХ АДНОСІН У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991 – 2010 гг.)

*Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі аналізуецца стварэнне і дзейнасць дзяржаўных органаў па рэгуляванні міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь. У 1990-х гг. органамі ўлады была прынята нарматыўна-прававая база, стварыўшая ўмовы для развіцця культур нацыянальных супольнасцей. У сярэдзіне 1990-х гг. быў створаны орган выканаўчай дзяржаўнай улады для забеспячэння ўмоў захавання этнічнай самабытнасці і выканання заканадаўства ў сферы рэалізацыі праў нацыянальных супольнасцей. У артыкуле выдзелены і ахарактарызаваны тры этапы ў дзейнасці дзяржаўных органаў па рэгуляванні міжнацыянальных зносін у Рэспубліцы Беларусь.*

## Уводзіны

Пасля атрымання незалежнасці ў Беларусі ўзнікла неабходнасць у рэарганізацыі існуючых і стварэнні новых структур органаў дзяржаўнай улады, у тым ліку ў сферы міжнацыянальных адносін. У беларускай навуцы гэта пытанне маладаследавана. Стварэнне і дзейнасць адпаведных органаў улады толькі ўзгадваліся ў кантэксце дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў публікацыях С. Буко, Н. Бурай, В. Касовіч, А. Макрушыч, А. Осіпава, В. Паўлоўскай, І. Пушкіна, М. Рыбакова [1–8]. Рэгуляваннем міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь займаліся прадстаўнічыя і выканаўчыя органы дзяржаўнай улады. Вопыт вырашэння міжнацыянальных праблем у судовым парадку ў краіне адсутнічае.

## Асноўная частка

Пасля правядзення ў 1990 г. выбараў у мясцовыя і Вярхоўны (ВС) саветы сталі адбывацца змены ў падыходах да вырашэння праблем міжнацыянальных

* Выпускнік гістарычнага факультэта 1989 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адносін у Беларусі. Першага чэрвеня 1990 г. у ВС былі ўтвораны пастаянныя камісіі, сярод якіх – Камісія па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах. У лютым 1993 г. змянілася яе назва – Камісія ВС Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай палітыцы і пытаннях СНД. 16.01.1996 г. была ўтворана Камісія па правах чалавека, нацыянальных пытаннях, СМІ, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі. Сёння профільнай структурай у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі. У Савеце Рэспублікі міжнацыянальныя адносіны ўваходзяць у кола пытанняў Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. У выніку іх працы на працягу 1990 – 1996 гг. у Беларусі створана заканадаўчая база для дзейнасці нацыянальных супольнасцей і стабільных, канструктыўных міжнацыянальных адносін. Былі прыняты Законы: "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь", "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь", "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь", "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь", "Аб бежанцах" і інш. [5, с. 189-190; 9, с. 108-109].

Спецыяльных дзяржаўных органаў у сістэме вышэйшай выканаўчай улады, якія займаліся праблемамі нацыянальных супольнасцей, у Беларусі да сярэдзіны 1990-х гг. не існавала, не было і механізмаў супрацоўніцтва ўладных структур і нацыянальных аб'яднанняў. Развіццём адукацыі на роднай мове займалася Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Падтрымку і фінансаванне культурных ініцыятыў нацыянальных супольнасцей ажыццяўляла Міністэрства культуры: арганізоўвала нацыянальныя фестывалі; вылучала сродкі на правядзенне конкурсаў, выстаў, утрыманне мастацкіх калектываў нацыянальных аб'яднанняў; мэтанакіравана займалася забеспячэннем спрыяльных умоў для развіцця мастацкай творчасці нацыянальных супольнасцей [10, арк. 11, 22; 11, арк. 30].

У мэтах эфектыўнага супрацоўніцтва дзяржаўных органаў кіравання з грамадскімі арганізацыямі нацыянальных супольнасцей і садзейнічання захаванню і развіццю іх культур, у студзені 1995 г. была створана Кардынацыйная рада па справах нацыянальных меншасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (СМ РБ). Старшынёй Рады з'яўляўся намеснік прэм'ер-міністра. Яе рашэнні насілі рэкамендацыйны характар.

Для правядзення эфектыўнай нацыянальнай палітыкі неабходна было вызначыць становішча спраў, якое склалася ў сферы забеспячэння праў нацыянальных супольнасцей, іх надзённыя праблемы і ўлічыць гістарычныя традыцыі. Таму 21–22 мая 1996 г. у г. Віцебску была праведзена навукова-практычная канферэнцыя "Нацыянальныя меншасці Беларусі: шляхі супрацоўніцтва і згоды". Выпрацаваная яе ўдзельнікамі Канцэпцыя нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі вызначыла асноўныя напрамкі праграмы тэарэтычнага забеспячэння і практычнай рэалізацыі нацыянальна-культурнага развіцця этнічных супольнасцей з улікам стратэгічных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, накіраваных на захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці краіны [12].

У студзені 1997 г. Прэзідэнтам РБ быў падпісаны Указ "Аб сістэме рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных ураду Рэспублікі Беларусь", паводле якога Рада па справах рэлігій пры СМ РБ ператваралася ў Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей (Дзяржкамітэт). Другога снежня 1997 г. пастановай СМ РБ пры ім была створана Каардынацыйная рада па справах нацыянальных меншасцей. Яна стваралася як грамадскае фармі-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

раванне. У склад Рады ўвайшлі прадстаўнікі міністэрстваў, органаў кіравання, нацыянальна-культурных аб'яднанняў Беларусі [4, с. 50-51; 13, с 46]. На пасяджэннях Рады абмяркоўваліся пытанні міжнацыянальных адносін і статутнай дзейнасці аб'яднанняў.

У лістападзе 2001 г. Дзяржкамітэт быў ператвораны ў Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры СМ РБ, які з'яўляўся рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і падпарадкоўваўся ўраду [13, с. 41-44]. 15 ліпеня 2006 г. пастановай СМ РБ ён быў рэарганізаваны і ў структуры ўрада з'явіўся апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Упаўнаважаны прызначаецца на пасаду Прэзідэнтам РБ па прапанове Савета Міністраў і падпарадкоўваецца ўраду. Пры Упаўнаважаным дзейнічаюць кансультатыўныя Міжэтнічная рада і Экспертная рада.

Кансультатыўная Міжэтнічная рада была створана ў 2004 г. Яна ў межах сваёй кампетэнцыі супрацоўнічала з Упаўнаважаным, садзейнічала захаванню і ўмацаванню міжнацыянальнай згоды ў Беларусі, стварэнню адпаведных умоў для рэалізацыі праў грамадзян розных нацыянальнасцей на адраджэнне сваіх нацыянальных каштоўнасцей, адукацыйна-асветніцкай, культурна-творчай, інфармацыйнай і іншай дзейнасці; рыхтавала прапановы па ўдасканаленні ўзаемадзеяння грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей; каардынавала дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, прадстаўнікі якіх уваходзілі ў склад Рады. Па прапанове Упаўнаважанага Рада размяркоўвала дзяржаўныя фінансавыя сродкі, накіраваныя на падтрымку праектаў з удзелам нацыянальных супольнасцей. Вырашаліся пытанні аб памяншэнні памераў арэнднай платы шэрагу грамадскіх этнакультурных аб'яднанняў, аб іх ільготным падаткаабкладанні ў гарадах і раёнах, на тэрыторыі якіх яны дзейнічалі, і інш. [8, с. 19-22]. У 2010 г. у склад Рады ўваходзілі 25 членаў – прадстаўнікоў нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў і іх саюзаў, зарэгістраваных у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Вялікі аб'ём працы па каардынацыі дзейнасці нацыянальных грамадскіх арганізацый ускладаўся на Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, які быў створаны ў 1994 г. і ўваходзіў у склад Міністэрства культуры. У яго кампетэнцыю ўваходзіла арганізацыйна-метадычная дапамога і матэрыяльная падтрымка этнічных супольнасцей у справе адраджэння і далейшага развіцця нацыянальных культур. На базе цэнтра ў 1995 – 2000-х гг. дзейнічаў шэраг самадзейных мастацкіх калектываў нацыянальных супольнасцей. Пры яго падтрымцы нацыянальна-культурныя аб'яднанні праводзілі свае традыцыйныя святы: Курбан-байрам, Пурым, Ханука, Мертышор і інш. [4, с. 53; 6, с. 158; 14, арк. 128-138]. З 2005 г. ён стаў падпарадкоўвацца апарату Упаўнаважанага.

На рэгіянальным і мясцовым узроўні ва ўсіх абласных выканаўчых камітэтах, а таксама ў Мінскім гарвыканкаме былі створаны саветы (аддзелы) па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Іх задачы галоўным чынам аналагічныя задачам, якія вырашаюцца Упаўнаважаным, за выключэннем удзелу ў распрацоўцы заканадаўства і міжнароднага супрацоўніцтва. У абласцях і гарадах ствараліся Каардынацыйныя рады грамадскіх і нацыянальных аб'яднанняў, палітычных партый і прафсаюзных арганізацый. Правядзеннем культурных мерапрыемстваў для нацыянальных супольнасцей, камплектаваннем бібліятэчных фондаў на мовах супольнасцей, у ліку іншага, займаліся аддзелы культуры адпаведных выканкамаў.

У краіне існавала Праграма мер па рэгуляванні этнаканфесійнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, якая разлічвалася на пэўныя перыяды.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мясцовымі ўладамі распрацоўваліся і дзейнічалі рэгіянальныя праграмы. Яны, як правіла, былі разлічаны на два гады [8, с. 19-22]. Прыярытэт у працы адпаведных дзяржаўных органаў атрымоўвалі праекты, праграмы і мерапрыемствы, якія мелі міжкультурны характар, інтэрнацыянальны кірунак. Найбольш паспяховым у дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання Беларусі з’явілася правядзенне фестываляў нацыянальных культур, якія актывізавалі культурна-асветніцкую дзейнасць нацыянальных аб’яднанняў і шырока папулярызавалі іх творчыя дасягненні. У перыяд 1996 – 2012 гг. адбылося 9 фестываляў [15].

Аналіз дзейнасці дзяржаўных органаў па рэгуляванні міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь дазваляе вылучыць некалькі этапаў: 1) першая палова 1990-х гг. – гэта перыяд, калі дзяржава прытрымлівалася ліберальнай мадэлі нацыянальна-канфесійных адносін; праводзілася палітыка неўмяшальніцтва ў дзейнасць грамадскіх нацыянальна-культурных аб’яднанняў; 2) з 1996 г. – паступовы адыход ад ліберальнай мадэлі да мадэлі супрацоўніцтва (кааперацыйнай мадэлі дзяржаўна-нацыянальных адносін); 3) з пачатку 2000-х гг. у нацыянальнай палітыцы заўважаецца імкненне да кантролю, унармавання і рэгулявання грамадскай дзейнасці, выкарыстоўваюцца праграмныя метады працы.

### Заключэнне

Такім чынам, у найноўшай гісторыі Рэспублікі Беларусь (1991 – 2010 гг.) органамі прадстаўнічай улады была прынята нарматыўна-прававая база, якая стварыла досыць камфортныя ўмовы для развіцця культур нацыянальных супольнасцей і задавальнення іх этнакультурных запатрабаванняў. Для рэгулявання міжнацыянальных адносін быў створаны адпаведны орган выканаўчай дзяржаўнай улады, які імкнуўся забяспечыць умовы для захавання самабытнасці і выканання заканадаўства ў сферы рэалізацыі праў нацыянальных супольнасцей. У краіне адбывалася падтрымка ініцыятыў і супрацоўніцтва з нацыянальнымі грамадскімі арганізацыямі для захавання ў беларускім грамадстве стабільнасці, дыялогу і супрацоўніцтва ў сферы міжнацыянальных адносін. Праз дзейнасць СМІ вялася прапаганда нацыянальнай адметнасці і культурнай разнастайнасці. Прыкладаліся намаганні для захавання нацыянальных моў і адукацыі на родных мовах. У структурах Міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі працавалі спецыялісты, якім было даручана аказваць дапамогу грамадскім нацыянальна-культурным аб’яднанням. У Беларусі былі створаны мінімальна неабходныя ўмовы для захавання і развіцця культуры нацыянальных супольнасцей, дзейнасці іх арганізацый.

Згодна з заканадаўствам нацыянальная палітыка органаў дзяржаўнага кіравання вызначалася: аказаннем матэрыяльнай і метадычнай дапамогі, правядзеннем выстаў, фестываляў нацыянальных культур і мастацтваў, святкаваннем галоўных дат у гісторыі той ці іншай нацыянальнай супольнасці, дапамогай у фінансаванні мастацкіх калектываў, каардынацыяй дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў і ораганаў улады.

Дзяржаўная падтрымка культурнай дзейнасці нацыянальных супольнасцей і кантроль за іх грамадскімі арганізацыямі актывізаваліся з другой паловы 1990-х гг. пасля стварэння органаў, адказных за правядзенне нацыянальна-канфесійнай палітыкі. За апошнія 10 год статус дзяржаўнага органа вышэйшай выканаўчай улады, які каардынаваў узаемаадносіны дзяржавы з нацыянальнымі супольнасцямі, знізіўся.

Нацыянальная палітыка дзяржаўнай улады насіла характар пратэкцыянізму і здзяйснялася ў цэлым выверанымі, прадуманымі крокамі, пры наяўнасці пэў-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ных недахопаў, якія можна выправіць. У дзеяннях улад прасочвалася схіленне да комплекснага вырашэння існуючых праблем нацыянальных супольнасцей. У выніку правядзення дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі, якая забяспечвала задавальненне культурна-асветных запатрабаванняў нацыянальных супольнасцей з улікам агульнанацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, у грамадстве склаліся стабільныя міжнацыянальныя адносіны.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*

1. ***Буко, С.*** Республика Беларусь – страна межнационального мира и согласия / С. Буко // Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь : даведнік / склад. Н.В. Ходар. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2004. – С. 3–5.
2. ***Бурая, Н.В.*** Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992 – 2004 гг.) / Н.В. Бурая // Весці БДПУ. – Серыя 2. – 2007. – № 1. – С. 46–49.
3. ***Касовіч, В.Ф.*** Дзяржаўная палітыка ў адносінах да нацыянальных меншасцей у Республіцы Беларусь / В.Ф. Касовіч // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя : матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 18-19 крас. 2003 г. – Мінск : БДПУ, 2004. – С. 224–225.
4. ***Макрушич, Е.Н.*** Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995 – 1998 гг.) / Е.Н. Макрушич // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. – Серыя 1. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. – 2008. – № 1. – С. 49–55.
5. ***Осипов, А.*** Этнокультурная политика в Беларуси: сопоставление с международным контекстом / А. Осипов // Вопросы меньшинств в Республике Беларусь, Европе и мире ; сост., авт. предисл. А. Оипов, А. Василевич. – Минск : Медисонт, 2012. – С. 171–198.
6. ***Паўлоўская, В.П.*** Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па развіццю культурна-асветніцкай работы сярод нацыянальных меншасцей Беларусі на сучасным этапе / В.П. Паўлоўская // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі. – Мінск : БДПУ імя М. Танка, 1997. – С. 153–160.
7. ***Пушкін, І.А.*** Заканадаўчыя асновы міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь (1991 – 2010 гг.) / І.А. Пушкін // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. – Серыя 1. – 2012. – № 1. – С. 70–79.
8. ***Рыбаков, М.Л.*** О межнациональных отношениях и государственной политике в Республике Беларусь / М.Л. Рыбаков // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я. Купалы ; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно : ГрГУ, 2010. – С. 19–22.
9. ***Пушкін, І.А.*** Дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР-Рэспублікі Беларусь па заканадаўчаму забеспячэнню міжнацыянальных адносін (1990 – 1996 гг.) / І.А. Пушкін // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол.: М.А. Можейко (отв. ред.). – Гродно : ГрГУ, 2012. – С. 105–109.
10. Дакументы аб супрацоўніцтве Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з культурнымі аб'яднаннямі нацыянальных меншасцей. 1993 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 33.
11. Звесткі аб творчай дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь. 2004 г. // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 474.
12. Канцэпцыя нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі / навук. рэд. С.А. Яцкевіч. – Мінск : Рэсп. цэнтр нац. культур, 1996. – 34 с.
13. **Пушкін, І.А.** Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990 – 2005 гг.) : манаграфія / І.А. Пушкін. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2007. – 206 с
14. Справаздача Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур. 2000 г. // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 407.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

15. Дакументы аб падрыхтоўцы і правядзенні Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 471. – Арк. 4-15; Спр. 804. – Арк. 1-169; Спр. 960. – Арк. 1-222; Спр. 962. – Арк. 11-12.

Паступіў у рэдакцыю 30.10.2012 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова